Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

Факультет начального образования

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

*Материалы II Международной студенческой научно-практической конференции*

*(в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего»)*

*г. Минск, 19 апреля 2018 г.*

*Научное электронное издание локального распространения*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
БГПУ
2018

**ISBN 978-985-541-517-7**

© Оформление. БГПУ, 2018

УДК 373.3
ББК 74.24
С568

Редакционная коллегия:
*Жданович Н. В.* (отв. ред.), кандидат филологических наук, доцент, декан факультета начального образования БГПУ;
*Азарко О. В.*, кандидат филологических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по учебной работе;
*Сорока О. Г.*, кандидат педагогических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по научной работе;
*Василевская Е. С.,* кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Качан О. Г.*, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Баранова Л. И.*, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики и психологии начального образования БГПУ

**Современные** тенденции развития начального образования: материалы II Междунар. студ. науч.-теор. конф., г. Минск, 18 апреля
С568 2018 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: Н. В. Жданович (отв. ред.) [и др.]. — Минск : БГПУ, 2018. — 224 с.

ISBN 978-985-541-515-7.

В сборнике представлены результаты исследований студентов, отражающие актуальные вопросы педагогики и психологии начального образования, методик преподавания учебных предметов в начальной школе.

Адресуется преподавателям, аспирантам, студентам и всем, кто интересуется проблемами педагогики, психологии младшего школьного возраста и методик преподавания в начальной школе.

*Минимальные системные требования:*
Операционная система Windows 98 и выше
Процессор Pentium III, RAM 32 Mb (ОЗУ), HDD 250 Mb
Видеоадаптер с разрешением 800×600, 256-цветов,
32 Mb видеопамяти, DVD-ROM, мышь

© Оформление. БГПУ, 2018

*Программное обеспечение:* Adobe Acrobat Reader

Ответственный за выпуск *О. Г. Сорока*
Техническое редактирование и компьютерная верстка *А. А. Покало*
Дизайн обложки *Е. С. Выдрицкой*

Дата подписания к использованию 03.10.18. 2,06 Mb. Тираж 5 электрон. экз. Заказ 621.

*Издатель и полиграфическое исполнение:* учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».

Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13. Ул. Советская, 18, 220030, Минск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КАЗКІ НА ЎРОКАХ КЛАСНАГА І ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

# THE STUDY OF THE BELARUSIAN FOLK TALE IN CLASSROOM AND EXTRACURRICULAR READING

*Ю.В. Гатоўчыц*

*Y. Gotovchits*

БДПУ, Мінск

Нав. кір. – А.С. Васілеўская, канд. філал. навук, дацэнт

Артыкул прысвечаны пытанню вывучэння беларускіх народных казак на ўроках кляснага і пазакласнага чытання ў пачатковай школе. Раскрываюцца праблемы, якія вырашаюцца на ўроках літаратурнага чытання пры вывучэнні беларускіх народных казак, ахарактарызаваны асноўныя віды беларускіх народных казак,прыведзены некаторыя шляхі і прыёмы работы з тэкстам беларускіх народных казак, якія можна выкарыстоўваць на ўроках.

Ключавыя словы:беларускія народныя казкі, віды казак, формы работы з тэкстам.

The article is devoted to the study of Belarusian folk tales in classroom and extracurricular reading classes in primary school. The author reveals the problems solved during literary reading lessons during the study of Belarusian folk tales, the main types of Belarusian folk tales are described, some ways and methods of working with the text of Belarusian folk tales that can be used in class are given.

Key words: Belarusian folk tales; types of fairy tales; form of work with the text.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У сучасным адукацыйным асяроддзі асаблівае месца павінна заняць культурна-асобасная падрыхтоўка навучэнцаў, якая мае на мэце далучыць малодшых школьнікаў да авалодвання нацыянальнымі і агульначалавечымі каштоўнасцямі, да ўсведамлення той культуры, таго сацыяльнага вопыту, які выпрацавала чалавецтва.

Эфектыўным сродкам для дасягнення гэтай мэты ў працы з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту можа служыць казка. У ёй уіншасказальнай форме зашыфраваны жыццёвы вопыт многіх папярэдніх пакаленняў, традыцый розных народаў, шматгранная і шматузроўневая інфармацыя.

«Изучение сказок в начальной школе предполагает решение следующих проблем:

- овладение социальным и нравственным опытом, представленным в сказках разных народов и авторских произведениях;
- приобретение нового жизненного опыта и проявлений нравственных качеств на новом уровне (любви, уважения в семье, милосердия, доброты, чуткости, сострадания, чувства долга, трудолюбия и т д.);

- обогащение эмоционально-ценностной сферы младших школьников, их представлений о мире и природе;
- развитие индивидуальности личности, ее творческой активности, самостоятельности, критичности мышления;
- расширение и углубление представлений и понятий о сказке как литературном жанре;
- развитие читательского интереса;
- развитие читательского умения;
- создание условий для формирования потребности в самостоятельном чтении» [4, с. 3].

Шляхі і прыёмы вывучэння казак залежаць ад яе тыпу – гэта народная ці літаратурная казка.

На базе ДУА «Сярэдняя школа № 175 г. Мінска» мы праводзілі тэст-дыягностыку, мэтай якога было выявіць уменне адрозніваць літаратурныя казкі ад народных. У тэсце прынялі ўдзел 23 вучняў 3 «Б» класа. Прааналізаваўшы вынікі, мы зрабілі выснову, што не ўсе дзеці ўмеюць адрозніваць народныя казкі ад літаратурных: 5 вучняў паказалі нізкі і здавальняючы ўзровень умення адрозніваць беларускія літаратурныя казкі ад беларускіх народных казак, большая колькасць дзяцей – 16 вучняў – паказалі сярэдні і дастатковы ўзровень, 2 вучні пардэманстравалі высокі ўзровень умення.

У сваю чаргу народныя казкі падзяляюцца на: казкі пра жывёл; чарадзейныя казкі; бытавыя або сацыяльна-бытавыя казкі.

Казкі пра жывёл лічацца самай старажытнай разнавіднасцю казачнага эпасу.Самыя вядомыя персанажы такіх казак – воўк, лісіца, мядзведзь, дзік, заяц, журавель, рак, сабака, кот, камар, баран, каза, певень, гусак, пчала, муха, чапля і інш., праз вобразы якіх нам паказаны людзі, іх паводзіны. У казках пра жывёл народ з павагай кажа аб сяброўстве, шчырай і бескарыснай дапамозе, імкненні да справядлівасці і рашуча асуджае няўдзячнасць, здрадніцтва таварышам. З тонкім гумарам народ высмейвае фанабэрыю, зайздрасць, баязлівасць, якая характэрна некаторым людзям.

Другая жанравая разнавіднасць – гэта чарадзейныя казкі. Яны пры сваёй ідэйна-тэматычнай разнастайнасці вылучаюцца агульнымі прыёмамі мастацкага адлюстравання рэчаіснасці.Героічарадзейнай казкі – асілкі, волаты або звычайныя людзі, якім дапамагаюць розныя чарадзейныя памочнікі. Ім супрацьстаяць незвычайныя істоты, надзеленыя звышнатуральнымі здольнасцямі: шматгаловы змей Паганы Цмок, Баба Яга, Кашчэй Бессмяротны, розныя чараўнікі і інш.

Сацыяльна-бытавыя казкіадрозніваюцца характарам мастацкай выдумкі, а таксама асаблівасцямі мастацкага асэнсавання рэчаіснасці.Сацыяльна-бытавыя казкі адлюстроўваюць жыццё ў крытычна-завостранай форме, заўсёды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праўдзіва адлюстроўваюць сямейныя і грамадскія з'явы, жыццё працаўнікоў,іх быт, сцвярджаюць народныя ідэалы і высмейваюць людскія недахопы.У такіх казках ідзе паказ рэальнага жыцця, высмейванне адмоўных чалавечых якасцяў. Высокія маральныя якасці належаць не багатым і людзям высокага рангу, а прадстаўнікам з народу, таму асноўныя героі – простыя людзі.

Мы прааналізавалі падручнікі па літаратурным чытанні для 2, 3 і 4 класаў [1; 3; 5; 6; 7], каб вызначыць, якія тыпы казак вывучаюцца ў пачатковай школе.

У 2-ім класе вывучаюцца чарадзейныяказкі («Два Маразы») і казкі пра жывёл («Лісіца і Гусак», «Хітры Вол», «Каза-манюка», «Муха-пяюха» і інш.). У 3-ім класе вывучаюцца сацыяльна-бытавыя казкі «Недалікатны сын» і »Зайздросны дзядзька».У 4-ым прадстаўлены ўсе віды казак: пра жывёл («Драч і крот»), чарадзейныя («Залаты збан», «З рога ўсяго многа»), сацыяльна-бытавыя («Сцізорык зламаўся», «Ад крадзенага не пасыцееш»). Такім чынам, у пачатковай школе вывучаюцца ўсе віды беларускіх народных казак.

У час праходжання педагагічнай практыкі мы распрацавалі канспект урока па вывучэнні казак»Недалікатны сын» і »Зайздросны дзядзька». Гэта сацыяльна-бытавыя казкі, таму пры працы з імімы выкарысталінаступныя формы работы над тэкстам: выбарачнае чытанне; адказы на пытанні; падзел на часткі і складанне плану казкі; пераказ блізкі да тэксту;складанне характарыстыкі героя казкі (мы прапанавалі набор характарыстык для кожнага героя, а дзеці выбіралі неабходныя); чытанне па ролях; выбар прыказак па галоўнай думцы з раду прыведзеных.

Такім чынам, ужо ў пачатковай школе вядзецца сапраўдная праца па засваенні мастацкіх тэкстаў, а значыць, засваенні і прысваенні вучнямі маральных узораў. Пры правільным, прафесійным кіраўніцтве настаўніка гэтым працэсам дзеці лёгка, з вялікай цікавасцю асвойваюць методыку і тэхналагічныя прыёмы аналізу мастацкага тэксту, а менавіта казкі, з якой ім падабаецца працаваць на ўроках літаратурнага чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Літаратура*

1. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навуч. : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 1–2.

2. Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падручнік для студэнтаў Б43 філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Лексіс, 2000. – 512с.

3. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 4-га кл. ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навуч. : у 2 ч. / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. – Ч. 1–2.

4. Воропаева, В. С. Литературное чтение. 3-4 классы. Путешествие в мир сказки : пособие для учителей общеобразоват. учреждений с рус.яз. обучения / В. С. Воропаева, Т. С. Куцанова. – Минск : Аверсэв, 2012. – 128 с.

5. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навуч. : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. — Ч. 1. — 145 с.

6. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навуч. : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 1–2.

7. Клышка, А. К. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 4-га кл. ўстаноў агул. сярэд.адукацыі з рус. мовай навуч. / А. К. Клышка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014. – 129 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ